# Чым жывеш, Востраў Свабоды?

Прызнацца шчыра, хацелася пачаць гэты артыкул неяк незвычайна. Аднак тэма Кубы непарыўна звязана з тымі вобразамі, што цягнуцца яшчэ з маленства. І гэта не стэрэатыпы, а частка менталітэту. Песні, фільмы, усім вядомая выява Чэ Гевары, якая стала адным з сімвалаў XX стагоддзя. Барадаты твар Фідэля – такі ж сімвал. А яшчэ маркі, што збіраў у дзяцінстве, а на іх – знакаміты гаванскі балет, працаўнікі на сафры. Уся гэта мешаніна сплятаецца ў адзінае адчуванне, ад якога пахне тытунём, цукровым трыснягом, акіянам і ромам. Нават калі ты ніколі не бываў на далёкім востраве Куба. І вось ужо селі ў самалёт, што пачынае свой 11-гадзінны палёт, а ў душы нейкае хваляванне: ці спраўдзяцца ўсе гэтыя чаканні?

## Вачыма турыстаў

Для тых, хто прыязджае на Кубу адпачыць (а такіх з кожным годам усё болей), гэта сапраўды райскае месца. Белыя пясчаныя пляжы – як з рэкламы, каралеўскія пальмы над імі, какосавыя арэхі, якімі можна пачаставацца тут жа пад пальмай, марскія прагулкі і знакамітая рыбалка – усё гэта сучасная Куба. А яшчэ легендарная гісторыя, экзотыка, да якой спакойна можна аднесці нават старыя амерыканскія (з 1950-х) і савецкія (з 1970–1980-х) машыны – сапраўдны музей на колах.

У дадатак да ўсіх прыгажосцяў, пахаў і ўражанняў – высакакласныя атэлі і сетка сучасных аэрапортаў. Прычым не толькі ў знакамітым Варадэра, але і на астравах Карыбскага мора, якія ўсё болей прывабныя для турыстаў.

Сярод замежных наведвальнікаў Кубы вельмі многа канадцаў. Вялікімі групамі яны «акупіруюць» кафэ і пляжы. Паўсюль можна чуць змешаную англа-французскую гаворку – фірменны знак канадскіх грамадзян. Але сярод іх нямала і выхадцаў з былога СССР. Напрыклад, мы сустрэлі кампанію маладых людзей, якія ў маленстве жылі ў Маскве і Рызе.

– Што вас прываблівае на Кубе? – пытаемся.

– Тут вельмі хораша і танна. Менш як за тысячу долараў мы можам амаль на два тыдні перанесціся з халоднай Канады ў лета.

– І толькі?

– Вядома, не, – усміхаюцца суразмоўцы. – Гэта сапраўдны востраў свабоды. У Манрэалі нам казалі, што тут дыктатура і таталітарны рэжым. А на самай справе на Кубе можна паводзіць сябе вельмі вольна. Нават менш абмежаванняў, чым у нас.

– Напрыклад?

Хлопец, карані якога з Латвіі, на секунду задумаўся, а потым паднёс да вуснаў цыгару і з пэўнай іроніяй адказаў:

– Тут можна курыць у кафэ. Зараз гэта рэдкасць.



▶ Лідар Кубінскай рэвалюцыі камандантэ Фідэль Кастра Рус

Цікава, што словы захаплення, радасці мы чулі і ад расійскіх турыстаў, якіх на Кубе таксама шмат.

Сапраўды, кубінцы вельмі многа робяць для таго, каб тым, хто прыязджае на востраў, было камфортна. І справа не толькі ў атэлях. Куба не такая багатая краіна, а на вуліцах чыста і акуратна. Старая Гавана – не проста квартал старой архітэктуры, а фактычна горад у горадзе – паступова аднаўляецца, прываблiваючы ўсё новых і новых наведвальнікаў.

Але, магчыма, гэта толькі вітрына для турыстаў? Такая прыгожая карцінка, каб прыцягнуць валюту багатых замежнікаў?

У пэўным сэнсе гэта так. І тут няма нічога дрэннага. Замежны турызм пачаў актыўна развівацца ў пачатку 1990-х гадоў, калі Куба перажывала адзін з самых цяжкіх перыядаў сваёй гісторыі, звязаны з распадам Савецкага Саюза. Адна са ставак у выратаванні нацыянальнай эканомікі тады была зроблена на турызм, адносна новую галіну. Ужо ў канцы 1990-х гадоў турызм, як асноўная крыніца замежнай валюты, перасягнуў цукар, адзін са стаўпоў кубінскай гаспадаркі. Цяпер турызм – сапраўдны флагман кубінскай эканомікі і па ўзроўні даходаў займае другое месца пасля нікелевай прамысловасці. Высокапастаўленыя ўрадавыя чыноўнікі характарызуюць яго як «сэрца эканомікі». Сёння Гавана выдзяляе значныя рэсурсы на будаўніцтва новых турыстычных аб'ектаў і рэканструкцыю гістарычных будынкаў для выкарыстоўвання ў сферы турызму. Некалі мізэрная колькасць замежных турыстаў у мінулым годзе павялічылася да 3 млн, а да 2020 года, па прагнозах кубінскага Міністэрства турызму, павінна дасягнуць 7 млн чалавек.

І ўсё ж турызм – гэта толькі вокладка, зробленая якасна і шчыра, за якой хаваюцца вельмі важныя працэсы, што закранаюць не толькі Кубу, а і ўсю Лацінскую Амерыку.

## Перадумовы рэформ

Амаль ад усіх суразмоўцаў на востраве даводзілася чуць словы «чорныя гады». Пры гэтым твары іх станавіліся сур'ёзнымі, з выразам смутку, што з жыццялюбнымі кубінцамі адбываецца нячаста. Цяжкія гады – гэта 1990-я, калі для Кубы нібыта абрынуўся свет, а заваяванні рэвалюцыі апынуліся пад пагрозай.

Эканамічнае і тэхнічнае супрацоўніцтва з СССР, якое адыгрывала ў паслярэвалюцыйны час важную ролю ў развіцці Кубы, з 1991 года было практычна згорнута. Незавершанымі засталіся больш як 20 буйных аб'ектаў, узвесці якія агульнымі намаганнямі прадугледжвалася шэрагам міжурадавых пагадненняў. А сярод іх атамная электрастанцыя «Хурагуа», нікелевы завод «Лас-Камарыёкас», цеплавая электрастанцыя «Гавана», нафтаперапрацоўчы завод у Сьенфуэгасе і інш. Інакш кажучы, не былі ўведзены ў эксплуатацыю менавіта тыя прадпрыемствы, ад якіх залежала далейшае паспяховае развіццё краіны.

Развал СССР і прыпыненне актыўнага супрацоўніцтва Кубы з былымі сацыялістычнымі краінамі сталі сапраўднай катастрофай. Сухія лічбы гавораць, што ў пачатку 1990-х гадоў ВУП Кубы скараціўся амаль на трэць, а гандлёвы абарот з дзяржавамі былога сацыялістычнага лагера – да 15 % ад узроўню 1988 года. Асабліва цяжкія наступствы былі звязаны з адмовай Расіі пастаўляць нафту на Кубу – аб'ёмы знізіліся з 12 млн т штогод да 2 млн. Фактычна такім чынам урад Барыса Ельцына далучыўся да блакады Кубы, абвешчанай ЗША. Востры дэфіцыт нафтапрадуктаў прывёў да значнага скарачэння сельскагаспадарчай вытворчасці, у тым ліку і цукровага трыснягу, які на той час заставаўся галоўнай экспартнай культурай краіны.

Найбольш яскрава атмасферу тых «чорных гадоў» перадаюць самі кубінцы. Грамадскі транспарт перастаў хадзіць. На вуліцах гарадоў з'явіліся гужавыя павозкі. З паліц магазінаў зніклі амаль усе тавары. З прадуктаў даступнай заставалася хіба што капуста. І ўсё ж кубінцы не былі б самі сабой, калі б нават у той вельмі цяжкай сітуацыі не знаходзілі нешта пазітыўнае ці нават смешнае. Знаёмая журналістка, узгадваючы той перыяд, пажартавала: «Затое знікла праблема пахудзення. Тоўстых людзей на Кубе не засталося. Усе мы тады сталі вельмі падцягнутымі з упалымі шчочкамі».

Тыя дні з гумарам можна ўзгадваць цяпер. У пачатку 1990-х усе ворагі Кубы чакалі, калі ж нарэшце падзе «рэжым Кастра». Рабіліся прагнозы: паўгода, год, ад сілы два. Здавалася, для гэтага былі ўсе падставы. Самыя нястойкія жыхары вострава



◀ Тарседор (скручвальнік цыгар) у Гаване

нават кінуліся на плытах і лодках пераплываць Фларыдскі праліў, што аддзяляе Кубу ад ЗША. У Маямі кубінскія эмігранты ўжо збіралі чамаданы, каб у хуткім часе прыбыць у Гавану і пачаць дзяліць маёмасць.

Аднак кубінцы выстаялі. Тых, хто хацеў уцячы з Вострава Свабоды, аказаліся адзінкі. Усіх грамадзян Кубы тады аб'яднала гісторыя Эліяна Гансалеса. Яго маці, ахопленая панічным настроем, без ведама бацькі хлопчыка прыхапіла сына, якому яшчэ не споўнілася і шасці гадоў, і ў лістападзе 1999 года паспрабавала пераплыць Фларыдскі праліў з групай такіх жа ўцекачоў. Але іх напаткаў трагічны лёс – яны патанулі. Эліян і яшчэ некалькі чалавек цудам засталіся жывымі: іх аўтамабільную камеру, на якой яны ўратоўваліся, прыбіла да берагоў Фларыды. У Злучаных Штатах жылі далёкія родзічы Гансалесаў. Зразумела, што бацька Эліяна патрабаваў вярнуць сына на радзіму. У адказ эмігранцкія арганізацыі ў Фларыдзе пры яўнай падтрымцы амерыканскіх улад разгарнулі шумную кампанію за тое, каб пакінуць хлопчыка ў Злучаных Штатах.

Кубінскае грамадства адгукнулася неверагоднай хваляй спачування і салідарнасці. Амаль штодзень на Плошчы рэвалюцыі і набярэжнай Малекон збіраліся дзясяткі тысяч чалавек, каб выказаць салідарнасць з самім Эліянам і яго бацькам. У рэшце рэшт, судовыя ўлады ЗША пагадзіліся, каб хлопчык вярнуўся на радзіму, але з адной умовай – калі бацька сам прыедзе і забярэ яго. Многім на Захадзе падавалася, што просты чалавек Хуан Мігель Гансалес Кінтана не вытрымае і застанецца ў ЗША. Тады б гэта выглядала як велізарнае ідэалагічнае паражэнне Гаваны. Выйшла ўсё наадварот. Хуан Мігель і Эліян разам вярнуліся дадому.

Кубінцы любяць узгадваць гэтую гісторыю. І сапраўды, яна паказвае моц іх нацыі, якая здолела прадэманстраваць кансалідацыю ў самых неспрыяльных умовах.

Абапіраючыся на народную падтрымку, Фідэль Кастра павёў дзяржаву да пераадолення крызісу. Улады ўвялі рэжым жорсткай эканоміі. Пачала дзейнічаць карткавая сістэма размеркавання харчовых і спажывецкіх тавараў.

Адначасова кубінскі ўрад быў вымушаны пайсці на шэраг захадаў па лібералізацыі эканомікі. У прыватнасці, сялянам было дазволена прадаваць лішкі выробленай прадукцыі па цане, вызначанай імі самімі, а гэта прывяло да фарміравання свабоднага ўнутранага рынку прадуктаў харчавання. Такім чынам, знізілася вастрыня харчовай праблемы, была прадухілена пагроза голаду. Адным з самых значных крокаў стала рашэнне адкрыць краіну для замежных грамадзян і пачаць развіваць індустрыю турызму. Тады ж быў дапушчаны на рынак Кубы амерыканскі долар. Яго выкарыстоўвалі для абмежаваных гандлёвых аперацый і куплі імпартных тавараў. У 1994 годзе быў уведзены канвертуемы песа, які па свайму курсу прыраўноўваўся да долара. А ўжо 8 лістапада 2004 года кубінскі ўрад у адказ на новыя санкцыі з боку ЗША выключыў з абароту долары. Зараз замежнікі, найперш турысты, у асноўным выкарыстоўваюць менавіта канвертуемы песа (CUC) для ўсіх разлікаў на востраве.

Кубінцам тады ж дазволілі атрымоўваць грашовыя пераводы ад родных, што знаходзяцца за мяжой (да 1200 долараў у год).

Першыя поспехі пераканаўча паказалі: жыць без падтрымкі СССР магчыма, але для гэтага трэба працягваць рэформы.

## Мадэрнізацыя Рауля Кастра

У 2008 годзе Рауль Кастра змяніў на вышэйшых пасадах свайго старэйшага брата, які, праўда, застаецца самым аўтарытэтным палітыкам не толькі на Кубе, але і ва ўсёй Лацінскай Амерыцы. «Камандантэ» – так

Беларуская Думка



▲ Аляксандр Лукашэнка і Рауль Кастра Рус. Гавана, 2012 год

паважліва называюць Фідэля Кастра і кубінцы, і замежнікі.

Урад Рауля Кастра ўнёс некаторыя змяненні ў кубінскую эканоміку, з акцэнтам на двух асноўных аспектах: імпартазамяшчэнне (сельскагаспадарчыя і прамысловыя тавары) і структурныя рэформы ва ўсіх галінах гаспадаркі. Мадэрнізацыя краіны, абнаўленне сістэмы кіравання – тыя пытанні, якія ўрад разглядае як найважнейшы элемент нацыянальнай бяспекі.

Рауль Кастра з моманту сваёй інаўгурацыі гаварыў пра ліквідацыю непатрэбных і застарэлых забарон. У 2009 годзе ў сваім выступленні ў парламенце ён сказаў, што «працэс абнаўлення кубінскай эканамічнай сістэмы павінен ісці без спешкі».

У чым жа сутнасць кубінскай мадэрнізацыі пры Раулю Кастра? Сацыялістычная сістэма планавання працягвае заставацца галоўным шляхам у кіраванні нацыянальнай эканомікай і павінна быць пераўтворана найперш у сваіх арганізацыйных аспектах, а таксама ў ажыццяўленні кантролю з боку дзяржавы. Планаванне эканомікі захоўваецца, але цяпер бяруцца пад увагу і рынкавыя абставіны.

Найбольш важнае тое, што новая мадэль прызнае, больш таго, актыўна падтрымлівае, акрамя сацыялістычных дзяржаўных прадпрыемстваў, якія з'яўляюцца галоўнай формай нацыянальнай эканомікі, таксама замежныя прадпрыемствы (сумесныя кампаніі і створаныя на аснове дагавораў пра міжнародную эканамічную асацыяцыю), кааператывы, дробных землеўладальнікаў, асоб, што маюць уласнасць у часовым карыстанні, арандатараў, работнікаў-прыватнікаў і інш. Галоўнае – садзейнічаць павелічэнню эфектыўнасці. Разам з тым кубінскія ўлады не дапускаюць канцэнтрацыі ўласнасці юрыдычнымі і фізічнымі асобамі. Гэта значыць, што пастаўлены заслон на шляху ўзнікнення алігархіі, буйных магнатаў.

Асноўныя кірункі гэтай новай мадэлі развіцця былі разгледжаны і ўхвалены на VI з'ездзе Камуністычнай партыі Кубы 18 красавіка 2011 года – «Напрамкі эканамічнай і сацыяльнай палітыкі партыі і рэвалюцыі». У гэтым дакуменце, у прыватнасці, сказана: «Дамагчыся таго, каб прадпрымальніцкая сістэма краіны складалася з эфектыўных і добра арганізаваных прадпрыемстваў, і ўтварыць новыя арганізацыі кіравання прадпрыемствамі больш высокага ўзроўню».

Але справа не абмяжоўваецца толькі эканамічнай сферай. На нядаўняй канферэнцыі «Праблемы сацыялістычнага пераходу на Кубе» Рафаэль Эрнандэс, галоўны рэдактар часопіса «Тэмас» (дарэчы, аналага «Беларускай думкі») адзначыў, што тыя рэформы, якія праходзяць зараз у яго краіне, азначаюць «сістэмныя змяненні ў палітыцы» і ўключаюць у сябе «пераразмеркаванне ўлады».

Якраз падчас нашага знаходжання на Кубе там адбываліся важныя палітычныя падзеі. Трэцяга лютага прайшлі выбары ў Нацыянальную асамблею Кубы. Парламент, які складаецца з 612 дэпутатаў, сабраўся на сваё першае пленарнае пасяджэнне. Дэпутаты перавыбралі на пасаду Старшыні Дзяржаўнага савета Кубы (фактычна прэзідэнта) Рауля Кастра.

Здавалася, што нічога незвычайнага не здарылася. Але ж… Якраз напярэдадні, падчас візіту расійскага прэм'ер-міністра Дзмітрыя Мядзведзева, Рауль Кастра сказаў журналістам загадкавую фразу: «Мне хутка споўніцца 82 гады. Маю права пайсці на пенсію, вам не падаецца?» І тут жа ўзмацніў інтрыгу, заклікаўшы не прапусціць яго прамову на інаўгурацыі, паабяцаўшы, што яна будзе цікавай.

Атрымалася сапраўды цікава. Рауля Кастра пераабралі на вышэйшую ў краіне пасаду. Аднак, выступаючы перад дэпутатамі, ён прапанаваў увесці для ўсіх дзяржаўных

служачых, у тым ліку і для кіраўніка дзяржавы, абмежаванне для заняцця сваіх пасад не больш як на два тэрміны. І паабяцаў, што і сам не пойдзе на трэці тэрмін.

Відавочна, што гэта ініцыятыва павінна прывесці да значнага амаладжэння кіруючых колаў Кубы. І яскравым пацвярджэннем таму стала выбранне першым віцэ-прэзідэнтам Кубы 52-гадовага Мігеля Марыа Дыяса-Канеля Бермудэса, былога міністра адукацыі. Адразу ўсе аглядальнікі падкрэслілі, што гэта першы кубінскі кіраўнік такога ўзроўню, які не прымаў удзелу ў Кубінскай рэвалюцыі. Відавочна, што на нашых вачах адбываецца паступовая перадача ўлады ад аднаго пакалення кубінскіх палітыкаў наступнаму. Менавіта гэта новае пакаленне павінна прадоўжыць эканамічную і палітычную мадэрнізацыю, захаваўшы асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Куба.

Пераемнасць пакаленняў і неадменнасць сацыялістычнага шляху падкрэсліў Пленум ЦК Камуністычнай партыі Кубы, які прайшоў напярэдадні пасяджэння Нацыянальнай асамблеі. Трэба нагадаць, што артыкул 5 Канстытуцыі Кубы абвяшчае: Кампартыя – «арганізаваны авангард кубінскага народа і з'яўляецца найвышэйшай сілай грамадства і дзяржавы». На Пленуме былі абмеркаваны ўсе кадравыя рашэнні. І пры гэтым асабліва падкрэслена, што даецца дарога новым пакаленням кіраўнікоў, якія будуць прытрымлівацца прынцыпаў пераемнасці і абнаўлення і такім чынам гарантаваць палітычную будучыню краіны. І гэтая ініцыятыва цалкам адпавядае той кадравай палітыцы, якую зацвердзіў VI з'езд партыі і яе першая Нацыянальная канферэнцыя.

## Ва ўмовах блакады

Становішча Кубы, а тым больш правядзенне рэформ, абцяжарваецца страшэннымі наступствамі эканамічнай блакады ЗША супраць гэтай краіны. І слова «страшэнныя» ў дадзеным выпадку не перабольшанне.

Блакада пачалася 6 ліпеня 1960 года, амаль адразу пасля перамогі рэвалюцыі. Тады Злучаныя Штаты скарацілі імпарт кубінскага цукру. У далейшым пятля блакады зацягвалася ўсё тужэй. Справа дайшла да фактычнай забароны ўсякіх кантактаў з Кубай. Прычым самыя моцныя ўдары амерыканцы нанеслі ў найцяжэйшыя для Кубы часы: у 1992 (Акт пра дэмакратыю на Кубе) і ў 1996 (закон Хелмса-Бёртана) гадах.

Што такое блакада на гэты час? Уведзены абмежаванні на ўвоз кубінскіх прадуктаў у ЗША і ўезд амерыканцаў на Кубу, а таксама любыя фінансавыя і гандлёвыя аперацыі з Кубай і яе грамадзянамі. Забаронены інвестыцыі ў кубінскую эканоміку і замарожаны кубінскія рахункі ў ЗША. Амерыканскім грамадзянам нельга набываць кубінскія тавары нават за межамі Злучаных Штатаў. Санкцыі за парушэнні вельмі жорсткія – да 10 гадоў зняволення і штраф 1 млн долараў для юрыдычных асоб і да 250 тыс. для грамадзян. Можа быць накладзены і асобны дадатковы штраф у памеры 55 тыс. долараў.

Трэба сказаць, што ў 1958 годзе на Злучаныя Штаты прыпадала 67 % экспарту Кубы і 70 % імпарту. А сама Куба была сёмым гандлёвым партнёрам для ЗША (3 % экспарту і 4 % імпарту).

Зразумела, асабліва цяжкімі наступствы блакады былі ў тыя самыя «чорныя гады». На гэта і разлічвалі ў Вашынгтоне, што і не ўтойвалі. Паводле кубінскіх ацэнак, агульнае ўздзеянне блакады на эканоміку вострава складае 104 млрд долараў (а з улікам абясцэньвання долара адносна золата – 974 млрд). Цікава, што, паводле даных Міжнароднай гандлёвай камісіі, штогадовыя страты саміх ЗША складаюць 1,2 млрд долараў.

І ўсё ж жыццё прабівае блакаду. Вымушаны з гэтым лічыцца і самі ўлады ЗША. Афіцыйны амерыканскі экспарт на Кубу ў 1999 годзе склаў 47 млн долараў, у асноўным медыцынскай і фармацэўтычнай прадукцыі і гуманітарнай дапамогі. У 2000 годзе Куба з'яўлялася апошнім з 180 імпарцёраў амерыканскай сельскагаспадарчай прадукцыі. Пасля аслаблення блакады Куба дасягнула

▼ **Галоўныя наступствы (у млн долараў) блакады ў адносінах да Кубы, 2010 год**

| | |
|---|---|
| Даходы, не атрыманыя ад экспарту | 40 427,5 |
| Страты ад змянення месц гандлю | 19 592,0 |
| Негатыўны ўплыў на вытворчасць прамысловасці і паслуг | 2 866,2 |
| Тэхналагічная блакада | 9 375,0 |
| Уздзеянне на сацыяльныя паслугі | 1 565,3 |
| Непасрэдныя фінансава-валютныя страты | 8 640,2 |
| Падбухторванне да «ўцечкі мазгоў» | 6 533,8 |



▲ Уладзімір Астапенка, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Куба

максімуму ў гандлі з ЗША ў 2001 годзе – 138 млн долараў, а ўжо ў наступным годзе гэты паказчык скараціўся да 45 млн, у 2003 – да 33 млн.

Лічыцца, што прыкладна 80 тыс. амерыканцаў штогод наведваюць Кубу, у тым ліку 3 тыс. па справах бізнесу. Грашовыя пераводы, якія кубінскія эмігранты з ЗША адпраўляюць дамоў, дасягаюць 1 млрд долараў у год. Вельмі цікавая сітуацыя складваецца з кубінскімі цыгарамі. У амерыканскай папулярнай культуры цыгары – сімвал багацця і магутнасці, гэта статусныя рэчы. Кубінскі тытунь нездарма мае рэпутацыю аднаго з найлепшых у свеце. Таму амерыканскія ўлады ідуць на хітрыкі. Напрыклад, яны прызнаюць права кампаній з Дамініканскай Рэспублікі выкарыстоўваць знакамітыя кубінскія маркі цыгар. Аднак сапраўдных аматараў не падмануць. Такім чынам, цыгара стала своеасаблівай тарпедай, якая наносіць удар сістэме санкцый.

У апошнія гады і Расія рэзка асуджае сам факт блакады Кубы. У час нядаўняга візіту ў Гавану пра гэта недвухсэнсоўна выказаўся прэм'ер-міністр Дзмітрый Мядзведзеў: «Мы сваю пазіцыю не змяняем, лічым, што гэта абсалютна абуральная справа. Гэта анахранізм мінулага, і чым хутчэй яна будзе адменена, тым лепш будзе для ўсіх. І не толькі для кубінцаў, але і для амерыканцаў, найперш за ўсё».

З 1992 года Генеральная Асамблея ААН прымае рэзалюцыі пра неабходнасць спынення блакады. Кожны раз пераважнай большасцю галасоў. 13 лістапада 2012 года чарговую рэзалюцыю падтрымалі 188 краін, 3 – выказаліся супраць, 2 – устрымаліся.

Пытанне цяпер не ў тым, прыслухаюцца ці не ў Вашынгтоне да міжнароднай супольнасці, а ў тым, наколькі хутка яны гэта зробяць.

## Карыснае сяброўства

Мы размаўляем з паслом Рэспублікі Беларусь на Кубе Уладзімірам Астапенкам. Гэта вопытны дыпламат, з добрай школай Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін за плячыма і вялікім жыццёвым вопытам. Ды і на пасадзе пасла ў Гаване ён ужо амаль пяць гадоў. Таму ў пэўным сэнсе яго можна назваць адным са стваральнікаў сучасных беларуска-кубінскіх адносін.

– У цэлым мы задаволены тым, як ідзе двухбаковае супрацоўніцтва. Найперш у эканамічнай сферы, – кажа Уладзімір Астапенка. – Новы імпульс беларуска-кубінскім адносінам надаў рабочы візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі на Кубу, што адбыўся ў чэрвені 2012 года. У яго ходзе былі дасягнуты дамоўленасці па далейшым паглыбленні двухбаковага супрацоўніцтва і падпісаны шэраг важных дакументаў. У развіццё гэтых дамоўленасцей у перыяд з 15 па 19 кастрычніка Рэспубліку Беларусь наведала афіцыйная дэлегацыя Кубы на чале з намеснікам старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Куба Марына Мурыльё, які таксама правёў вельмі важныя перамовы ў Мінску.

– Наколькі вядома, у 2012 годзе Беларусь і Куба дасягнулі рэкорднага тавараабароту – 101,9 млн долараў. Гэта ўдвая больш, чым у мінулым годзе.

– Так, паказчык добры, але мы не спыняемся. Нядаўна, 5 лютага, я сустракаўся з дырэктарам Дэпартамента Еўропы Міністэрства знешняга гандлю і замежных інвестыцый Кубы Педра Пабла Сан Хорхэ Радрыгесам. Мы прыйшлі да паразумення наконт пашырэння гандлёва-эканамічнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Гаворка ідзе пра пастаўкі беларускай прадукцыі на Кубу і кубінскіх фармацэўтычных і біяпрэпаратаў у Беларусь, сэрвіснае абслугоўванне беларускіх трактароў, аўтобусаў і грузавых аўтамабіляў, мадэрнізацыю станочнага парка Кубы. І адзін з галоўных нашых праектаў – стварэнне сумесных зборачных прадпрыемстваў.

Дарэчы, трэба падкрэсліць, што дасягненні Кубы і Беларусі ва ўзаемавыгадным супрацоўніцтве выглядаюць тым больш значнымі, калі параўнаць іх з аналагічным паказчыкам Расіі. Яе гандлёвы абарот з Кубай за 2012 год склаў усяго 230 млн долараў.

Міждзяржаўнаму дыялогу садзейнічае амаль поўнае палітычнае паразуменне, якое існуе паміж Гаванай і Мінскам, узаемадзеянне на міжнароднай арэне, у тым ліку і ў ААН, Руху недалучэння. Калі казаць шчыра, то Куба з'яўляецца надзейным плацдармам для садзейнічання інтарэсам нашай краіны ў дзяржавах лацінаамерыканскага рэгіёна.

Неаднойчы кубінскія калегі з гонарам гаварылі, што менавіта Фідэль Кастра

пазнаёміў Аляксандра Лукашэнку з Уга Чавесам. І гэта стала пачаткам вялікага сяброўства не толькі двух лідараў, але і краін.

Пазіцыі, якія страціла Расія на Кубе, хутка займаюць іншыя дзяржавы. Зараз у чацвёрку найбуйнейшых знешнеэканамічных партнёраў Кубы ўпэўнена ўваходзяць Венесуэла, Кітай, Канада і Іспанія. І Кітай павышае сваю долю. На вуліцах Гаваны, Матансаса, іншых гарадоў вельмі часта можна сустрэць кітайскія аўтобусы, машыны. Прыемна, што паміж імі дзе-нідзе ды прабяжыць айчынны МАЗ.

І ўсё ж менавіта Венесуэла – краіна, асабліва значная для Кубы, стала за апошнія паўтара дзясятка гадоў яе галоўным саюзнікам і эканамічным партнёрам. Гэтае збліжэнне звязана з імем венесуэльскага прэзідэнта Уга Чавеса. У кастрычніку 2000 года паміж краінамі было заключана Комплекснае пагадненне аб супрацоўніцтве, якое ахоплівала ўсе сферы двухбаковых адносін. У снежні 2004 года ў Гаване Уга Чавес і Фідэль Кастра падпісалі Сумесную дэкларацыю аб рэалізацыі Баліварыянскай альтэрнатывы для Амерыкі (АЛБА).

Адносіны Гаваны і Каракаса можна параўнаць з інтэграцыйнымі працэсамі паміж Беларуссю і Расіяй, якія стварылі Саюзную дзяржаву. Хоць, вядома, лацінаамерыканцы яшчэ не дасягнулі такога інстытуцыянальнага ўзроўню. Затое ўзаемаразуменню паміж краінамі і іх лідарамі можна толькі пазайздросціць. «Нельга вырашыць праблемы голаду і галечы ва ўмовах капіталізму, – тлумачыў сваю пазіцыю прэзідэнт Венесуэлы. – Адзіна правільны шлях – гэта сацыялізм. Але гаворка ідзе не пра любую форму сацыялізму, а пра стварэнне новага сацыялізму, сацыялізму XXI стагоддзя, стагоддзя лацінаамерыканскай свабоды». АЛБА ў перспектыве ставіць сваёй мэтай інтэграцыю народаў Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна, аб'яднаных геаграфічнай прасторай, гістарычнымі і культурнымі сувязямі, агульнымі інтарэсамі і праблемамі, магчымасцямі. Інтэграцыя, як задумвалі яе пачынальнікі Фідэль Кастра і Уга Чавес, павінна будавацца на прынцыпах кааперацыі, салідарнасці і дапаўняльнасці. Яна павінна стаць альтэрнатывай мадэлі эканамічнага неалібералізму, што не прынёс нічога, акрамя паглыблення структурных асіметрый і ўмоў для канцэнтрацыі багаццяў у руках прывілеяванай меншасці за кошт цэлых народаў. Потым Куба і Венесуэла пашырылі Комплекснае пагадненне, падпісаўшы адпаведны дакумент, які канкрэтызаваў інтэграцыйныя працэсы паміж краінамі з улікам палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і прававой сітуацыі ў абедзвюх краінах.




На плакаце «Магутная і пераможная Рэвалюцыя працягваецца» маладыя Фідэль і Рауль Кастра са сваімі байцамі

***

На жаль, «нататак вандроўніка» не атрымалася. І не таму, што кубінскі каларыт не ўражвае. Хутчэй, наадварот. Можна было б многа напісаць і пра прыгожых кубінскіх жанчын, і пра ром і цыгары. А яшчэ пра выдатныя дасягненні кубінскіх спартсменаў, якія па-ранейшаму захапляюць сваімі поспехамі (вось бы з каго браць прыклад айчынным майстрам спорту). Аднак вельмі інтэнсіўныя сучасныя палітычныя і эканамічныя працэсы на востраве выклікаюць не меншую цікавасць, чым шмат разоў апісаная экзотыка. Востраў Свабоды жыве і развіваецца насуперак усім нядобразычлівым прагнозам, насуперак волі вялікага суседа, насуперак блакадзе. І Куба ў гэтым плане застаецца сцягам, арыенцірам для тых краін, што імкнуцца не плесціся ў хвасце, а ісці сваім шляхам.

**Вадзім ГІГІН,**
**кандыдат гістарычных навук,**
**дацэнт**